# ЧАКАЕМ ВАС, ТАВАРЫШЫ!

## *Пісьмо выпускніка*

Штогод нямала выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна прыязджае на працу ў Клецкі раён Мінскай вобласці. Свае багатыя веды, якія атрымалі за час вучобы ў буйнейшай навучальнай установе рэспублікі, яны стараюцца аддаць выхаванню нашага малодшага, падрастаючага пакалення. Мы ніколі не забываем аб слаўных традыцыях універсітэта, у памяці назаўсёды засталіся бацькоўскія клопаты і парады выкладчыкаў. Таму мы заўжды жывем з БДУ імя Ул. І. Леніна і сваімі працоўнымі справамі памнажаем яго славу. Мы жывем такой думкай: «Высока трымаць на вытворчасці гонар універсітэта». Запрашаем да нас, цябе, выпускнік, прыязджай у нашу працоўную сям'ю раёна. Тут кожнаму з вас знойдзецца справа па душы.

А цяпер, дружа, я раскажу табе, як працуюць у нашым раёне твае старэйшыя таварышы.

Выпускніка беларускага аддзялення філалагічнага факультэта Аляксандра Цалко прыкмецілі ў Нагорнаўскай сярэдняй школе як выдатнага педагога, практыка. Сваю шматгранную выхаваўчую дзейнасць у школе ён спалучаў з вялікай прапагандысцкай работай сярод насельніцтва. Так, адразу ж пасля заканчэння універсітэта ў 1963 годзе Аляксандр не стаў доўга думаць на раздарожжы, а адразу ўключыўся ў бурны вір жыцця. Колькі ім прачытана лекцый, колькі каштоўных, незабыўных парад выхаваўчага характару дадзена калгаснікам! Цяпер Цалко—намеснік дырэктара Нагорнаўскай сярэдняй школы па вучэбна-выхаваўчай рабоце і аднначасова выкладае рускую літаратуру і грамадазнаўства. Па-ранейшаму настаўнік вядзе вялікую грамадскую работу. Ён з'яўляецца намеснікам сакратара партыйнай арганізацыі і загадчыкам агіткалектыва калгаса «Зара камунізма», кіруе пачатковай палітшколай сельскіх камуністаў.

У гэтай жа школе настаўнічаюць і выпускнікі філфака Марыя Вяршкова, Лена Рокач, фізфака—Сяргей Мілаванаў. А маладыя настаўнікі Уладзімір Фалюк і Валя Носан вучацца завочна на матэматычным факультэце універсітэта.

Пяць выхаванцаў БДУ працуюць у Заастравецкай сярэдняй школе. Сярод іх філолагі Мікалай Прышчэпа, Іван Кулік, Тамара Карловіч, біёлаг Пятро Жукоўскі, гісторык Уладзімір Бертош.

Многія выпускнікі універсітэта вылучаны грамадскасцю на кіруючыя пасады. Так, Паўла Куцко назначылі намеснікам спецыяльнага тэхнічнага вучылішча, Анатоля Усцілку—загадчыкам раённага аддзела культуры, Уладзіміра Дзікевіча — дырэктарам Ліскаўскай сярэдняй школы, Ванду Тамковіч — дырэктарам Клецкага дзіцячага саду. Нядаўна Ванду Анатольеўну Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў ордэнам Леніна.

Выдатна працуюць таксама філолагі Васіль Максімовіч з Чырвоназвёздаўскай сярэдняй школы, матэматык Аліна Еўсевіцкая з Ліскаўскай СШ, біёлаг Галіна Тамашэвіч з Гурнаўскай сярэдняй школы і многія, многія іншыя.

Мы падтрымліваем цесную сувязь адзін з адным, заўсёды цікава адзначаем дзень заканчэння універсітэта, часта абменьваемся сваім вопытам у рабоце.

Віншуем усіх студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта з поспехамі ў сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 50-годдзя Савецкай улады і жадаем усім вялікага асабістага шчасця, поспехаў у вучобе, у выхаванні высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Ул. КАВАЛЬКОЎ,
загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі Клецкага райкома КПБ, выпускнік аддзялення журналістыкі 1962 года.



*За плённую перакладчыцкую дзейнасць, за заслугі ў галіне ўмацавання дружбы паміж беларускай і балгарскай літаратурамі Прэзідыум Народнага Сходу Народнай Рэспублікі Балгарыі ўзнагародзіў выкладчыка філалагічнага факультэта Ніла Гілевіча ордэнам Кірыла і Мефодзія І ступені. Некалькі дзён назад у пасольстве Народнай Рэспублікі Балгарыі ў Маскве адбылося ўручэнне ўзнагароды. Ад імя Прэзідыума Народнага Сходу ордэн уручыў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Народнай Рэспублікі Балгарыі ў Савецкім Саюзе Стаян Караджоў.*

*Фота А. ДЗІТЛАВА.*


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 35 (647) Пятніца, 25 лістапада 1966 года. Год выдання XX. Цана 2 кап.


*Насустрач 50-годдзю Савецкай улады*

# ТЫСЯЧЫ ТАМОЎ ТВАІХ СЯБРОЎ

Бібліятэка нашага універсітэта карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод студэнтаў і прафесарска - выкладчыцкага саставу. Апроч таго, што ў ёй маюцца ў вялікай колькасці падручнікі, мастацкая і навуковая літаратура, газеты і часопісы, тут добра наладжана абслугоўванне чытачоў. Кожны дзень пасля заняткаў сюды прыходзяць студэнты: адны, каб узяць неабходную кнігу, другія, — папрацаваць у яе гасцінных чытальных залах. Так, так, іменна гасцінных. Ужо тая акалічнасць, што гэтыя залы заўсёды перапоўнены, гаворыць сама за сябе. Куды б вы ні зайшлі — ці ў бібліятэку, ці ў чытальную залу — заўсёды ўбачыце там добра аформленыя кніжныя выстаўкі, вітрыны, спіс рэкамендуемай літаратуры. У нашай бібліятэцы ўжо стала традыцыяй праводзіць такія выстаўкі, дыспуты і іншыя цікавыя мерапрыемствы. Нездарма ў мінулым годзе ёй было прысуджана першае месца сярод бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў у сістэме міністэрства вышэйшай адукацыі рэспублікі. А ў гэтым годзе наша бібліятэка далучылася да Усесаюзнага агляду бібліятэк, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады.

Мы ў дырэктара бібліятэкі Разаліі Герасімаўны Любінай. Яна з радасцю расказвае аб плённай працы калектыву работнікаў чытальных залаў, абанемента, даведча-бібліяграфічнага аддзелу. Вядома, прыемна гаварыць аб добрым, дасягнутым. Разалія Герасімаўна спасылаецца на дапамогу актыва. Пры бібліятэцы створан савет. У яго ўваходзіць 20 чалавек: прафесары, дацэнты, загадчыкі кафедраў і кіраўнікі бібліятэкі. Акрамя плана работы бібліятэкі, савет зацвердзіў свае мерапрыемствы, прысвечаныя 50-годдзю Савецкай улады. У гэтым плане значнае месца адводзіцца арганізацыі выставак, якія раскажуць аб дасягненнях Беларусі і ўсёй нашай краіны, аб поспехах нашага універсітэта. Прадугледжана сістэматычна праводзіць вусныя бібліяграфічныя агляды ў студэнцкіх групах і чытальных залах на тэму «Дарогай бацькоў».

Трэба адзначыць, што план мерапрыемстваў паспяхова выконваецца. У гэтым годзе было арганізавана некалькі тэматычных выставак кніг.

Вось некаторыя з іх: «100 гадоў з дня адкрыцця Першага кангрэсу І Інтэрнацыянала», «Вялікі Кастрычнік, год 49-ы», «Дзень нараджэння камсамола» і іншыя. Многія выстаўкі прысвячаюцца творчасці савецкіх і зарубежных пісьменнікаў. Тэматычныя выстаўкі арганізоўвае бібліяграфічна - даведачны аддзел разам з аддзелам абслугоўвання. З вялікай любоўю гэтую работу выконваюць З. Рахманчык, Л. Палевіна, Е. Грахоўская, Н. Міцкевіч, Л. Пяскоўская і іншыя.

Зацікаўленасць чытачоў выклікаюць так званыя інфармацыйныя выстаўкі. Яны нагадваюць штотыднёвыя агляды твораў, якія арганізоўвае аддзел апрацоўкі літаратуры (загадчык аддзелам М. Падскрыбаева). Дзяжурства нясуць усе работнікі аддзелаў.

Неабходна адзначыць, што ва ўсіх групах першых курсаў універсітэта ўжо праведзены чатырохгадзінныя заняткі па пытаннях бібліяграфіі і культуры чытання. Заняткі заканчваліся аглядам літаратуры. Тэматыка іх была звязана з 50-годдзем Савецкай улады.

Развітваючыся, мы жадаем усім супрацоўнікам бібліятэкі і яе ветэрану Разаліі Герасімаўне Любінай новых поспехаў, жадаем заняць пачэснае месца на Усесаюзным аглядзе бібліятэк. У адказ знаёмае: «Заходзьце ў бібліятэку, тут вас чакаюць сябры і настаўнікі—кнігі».

М. ГЕРАХОВІЧ.

# ШКОЛА СІЛЫ І ПРЫГАЖОСЦІ

Сёлета ў пяты раз студэнты нашага універсітэта прымалі ўдзел ва Усесаюзных студэнцкіх гульнях. З кожным годам усё большы і большы ўклад уносяць яны ў агульны рахунак ачкоў рэспублікі. Калі на І і ІІ Усесаюзных студэнцкіх гульнях, якія праходзілі ў 1956 і 1960 гадах, універсітэт быў прадстаўлены толькі жаночай валейбольнай камандай, то ўжо на IV у Рызе—васьмю: па лёгкай атлетыцы, спартыўнай гімнастыцы (жанчыны), плаванню, веласпорту (мужчыны і жанчыны), баскетболу (жанчыны) і фехтаванню.

У адрозненне ад мінулагодніх, на V Усесаюзных студэнцкіх гульнях прынялі ўдзел не зборныя каманды вну, а зборныя рэспублік, і толькі па іграх відах спорту дапускаліся каманды спартыўных клубаў. У саставы каманд рэспублікі ўключаліся майстры і кандыдаты ў майстры спорту, у іграх відах спорту дапускаліся і спартсмены першага разраду.

Рэктарат, кафедра і спартыўны клуб распрацавалі канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы спартсменаў універсітэта да гэтых буйнейшых спаборніцтваў, якія праводзіліся строга па плану. Асаблівую ўвагу мы звярнулі на арганізацыю выступленняў спартсменаў, як кажуць, у сябе дома, і на іх актыўны ўдзел у сустрэчах па-за сценамі універсітэта. Так, вельмі многа для калектыву і асобных спартсменаў дала XIV агульнауніверсітэцкая спартакіяда. За час яе правядзення па 23 відах спорту выступіла звыш трох тысяч студэнтаў і супрацоўнікаў. Затым значнага поспеху дабіліся нашы зборныя каманды на гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах. Дастаткова сказаць, што сем студэнтаў выканалі нарматыў майстра спорту, дваццаць—кандыдатаў у майстры спорту, восемдзесят адзін — першага разраду і 983 — другога і трэцяга.

Спартыўны калектыў універсітэта прыняў таксама ўдзел і ў IX спартакіядзе рэспублікі сярод вышэйшых навучальных устаноў па 17 відах спорту. Прадстаўнікі універсітэта з гонарам абаранілі спартыўны гонар БДУ. У агульным заліку яны занялі другое месца, уступіўшы першынство спартсменам ІФК. Упершыню мы выйгралі спартакіяду ў студэнтаў політэхнічнага інстытута. Паспяхова на першынстве рэспублікі выступілі нашы лёгкаатлеты (старшы выкладчык В. Р. Кушнароў, Р. І. Жаўнерка), плаўцы (выкладчык І. В. Бедакурава). Гэтыя каманды заваявалі першыя месцы сярод студэнцкіх каманд рэспублікі, другія месцы занялі нашы каманды па цяжкай атлетыцы, фехтаванню і баскетболу.

У выніку праведзеных спаборніцтваў 40 спартсменаў атрымалі пачэснае права абараняць спартыўны гонар нашай рэспублікі на V Усесаюзных гульнях, дзе гэты калектыў заваяваў пяць медаляў. Найбольшага поспеху дасягнуў старшы выкладчык кафедры В. М. Фефелаў, выступаючы ў складзе зборнай каманды па класічнай барацьбе, ён стаў чэмпіёнам гульняў у сярэдняй вазе, за што і быў узнагароджан залатой медаллю.

Сярэбраныя медалі прывезлі студэнтка шостага курса фізічнага факультэта З. Калацкая і студэнт другога курса А. Лазараў (велатрэк), студэнтка трэцяга курса хімфака З. Давідчык (па скачках у даўжыню) і студэнт трэцяга курса Г. Папко, які выступіў у складзе зборнай каманды рэспублікі па воднаму пола. Бронзавай медаллю ўзнагароджан студэнт другога курса матфака І. Тарасюк за трэцяе месца ў трайным скачку. Спартсмены універсітэта «унеслі» ў агульны залік рэспублікі сорак ачкоў.

Падвёўшы вынікі гэтых і другіх масавых спаборніцтваў, мы прышлі да вываду, што універсітэцкі спартыўны калектыў мае магчымасць сказаць сваё гучнае слова і на IV юбілейнай спартакіядзе народаў СССР, якая будзе праводзіцца ў жніўні 1967 года ў Маскве. Але, каб добра да яе падрыхтавацца, атрымаць права ўдзелу, трэба многа папрацаваць і кафедры, і ўсяму нашаму актыву. Ужо цяпер трэба ўзмацніць работу ў гэтым напрамку. Было б вельмі добра, каб актывісты факультэтаў яшчэ раз праверылі «свае сілы», дапамаглі нам адшукаць здольных юнакоў і дзяўчат сярод першакурснікаў. Адным словам, кожны, хто любіць спорт, павінен лічыць сваім гонарам спаборнічаць за права ўдзелу ў спартакіядзе, прысвечанай пяцідзесяцігоддзю Савецкай улады.

Асноўная ўвага кафедры фізвыхавання і спорту цяпер накіравана на падрыхтоўку да чацвертай юбілейнай спартакіяды СССР. Мы добра ведаем, што галоўная задача студэнтаў — гэта вучоба. Таму мы і надалей будзем дапамагаць ім спалучаць паспяховую вучобу з падрыхтоўкай да будучай спартакіяды.

Неабходна таксама, каб на ўсіх факультэтах звярнулі самую сур'ёзную ўвагу на агульную фізічную падрыхтоўку у студэнтаў для таго, каб спорт у нас стаў сапраўды масавым і садзейнічаў умацаванню здароўя студэнтаў. Нездарма ў нашым універсітэце шматлікі калектыў спартсменаў называюць школай сілы і прыгажосці.

В. ШАПЯЛЕВІЧ,
загадчык кафедры фізвыхавання і спорту.

**Камсамольскае жыццё**

# ПАД АСАБІСТУЮ АДКАЗНАСЦЬ

ЁН ВЕЛЬМІ хацеў паехаць на цаліну, першым прынёс заяву. «Узяць ці не ўзяць?»—паўстала перад членамі камітэта камсамола думка. Большасць схілілася да апошняга.

Прыпомнілі, як першакурснік Лісоўскі паводзіў сябе на працягу вучэбнага года. Закончыўся вечар адпачынку. Зала, у якой весялілася моладзь, заставалася непрыбранай. Усе разыходзіліся дадому.

— Ваня, дапамажы прыбраць смецце,—папрасіла дзяўчына.

Лісоўскі абразліва скрывіўся і выпаліў:

— Што я затычка якая, хай іншыя дапамагаюць...

Былі здзіўлены студэнты першага курса аддзялення рускай мовы і літаратуры, калі Лісоўскі прыходзіў на лекцыі з новай «экстравагантнай» прычоскай. Доўгія, абыякава зачэсаныя касмачы, задужа доўгія, аж да самых шчэляпаў «бакі» так закрывалі яго твар, што з-пад іх вытыркаўся толькі адзін нос.

— Не смяшы людзей,—раілі Лісоўскаму таварышы, — глядзець на цябе брыдка.

— Густ, густ разумець трэба, а гэта не кожнаму даецца,—ганарліва агрызаўся Іван.—Мне таксама хочацца культурным быць.

— Якая ж гэта культура?

Але Іван не слухаў. Ён па-ранейшаму выхваляўся сваім выглядам. Мала таго, неўзабаве на яго шыі паявіўся нейкі «ланцужок—экстра»...

Скардзіўся і стараста:

— Што рабіць? Зусім не рыхтуецца хлопец да заняткаў.

Так паводзіў сябе і вучыўся Лісоўскі. Цяпер вельмі хацеў паехаць на цаліну, цяпер на перапынках лавіў членаў камітэта:

— Вазьміце...

Але яму адмовілі—непадыходзячая кандыдатура. Тады Іван накіраваўся да камандзіра будаўнічага атрада «Ветразі», які фарміравалі для працы ў Лагойскі раён. У Федзі Клімаўца, камандзіра атрада, якраз не хапала людзей. Таму ён, хоць і не зусім ахвотна, згадзіўся.

— Пад асабістую адказнасць, — сказалі Федзю ў камітэце камсамола.

І вось працоўны семестр закончаны. Учарашнія цаліннікі, лесарубы, будаўнікі сёння радасна і ўсхвалявана дзеляцца ўражаннямі, расказваюць пра сябе, слухаюць таварышаў. У гэты дзень упершыню добрым словам успомнілі Ваню Лісоўскага. Гэта здзівіла многіх. Тут толькі высветлілася, што Ваня добры каменшчык, што ён—працаўнік і, наогул, Лісоўскі—нядрэнны хлопец.

Што гэта? Чалавек трапіў у іншыя абставіны? Чалавек карэнным чынам змяніўся, перавыхаваўся? Не, не змяніўся. Ён быў такім. Добрае яму было прысутна з дзяцінства. Дрэннае ў ім было таксама. Але заўважылі чамусьці толькі дрэннае і прыляпілі на чалавека кляймо. І пасля гэтага ўжо ніхто не шукаў у паводзінах Лісоўскага іншых рыс. Дрэннае бачылі, але характар Лісоўскага, яго паводзіны заставаліся самі па сабе.

Я ў гэтым артыкуле прывёў адзін прыклад, але і з яго можна меркаваць, што нярэдка яшчэ ў нас абмяжоўваюцца толькі размовай пра індывідуальны падыход, пра асабістыя запатрабаванні камсамольцаў. Размова з людзьмі, высвятленне асаблівасцей характару кожнага камсамольца, здольнасці чалавека застаюцца па-за ўвагай камітэтаў камсамола. Звычайна актывістамі лічаць выбраных. Выбралі, скажам, у камітэт камсамола, у прафком — значыць, актывіст. Таму нярэдка актывіст па штату не з'яўляецца актывістам на справе. Чалавек не цураецца грамадскай работы, але рабіць яе не можа, бо яна яму не па душы, не па сэрцу. А той, хто зможа, застаецца непрыкмечаным і праявіць свае здольнасці можа толькі выпадкова. Мне здаецца, што трэба больш давяраць чалавеку, верыць у яго сілы. Усе ведалі, што Сяргей Законнікаў піша вершы, а аб тым, што Сяргей у дадатак да паэтычных здольнасцей мае і арганізатарскія, ніхто сур'ёзна не зацікавіўся. І вось здарылася нечаканае. Выбраны ў камітэт камсамола адказны за распаўсюджванне перыядычнага друку адсутнічаў доўгі час на факультэце. Каму даручыць гэты сектар работы? Раіліся, перабіралі кандыдатуры актывістаў. А пасля вырашылі даручыць гэта радавому камсамольцу Сяргею Законнікаву і ён добра справіўся з гэтай задачай.

Шмат спрэчак выклікае ў нас і актыўнасць сярод старшакурснікаў. Маўляў, чым бліжэй да дыплома, тым больш паяўляецца пасіўнасці. Але чаму ўкараняецца такая думка? Няўжо існуе граніца, перайшоўшы якую, чалавек становіцца пасіўным? Не, у пасіў яго залічвае камітэт камсамола, і не толькі таму, што ёсць прычына, а проста па традыцыі. На мой погляд, трэба ў кожным камсамольцы знайсці актывіста, нельга ніколі забываць пра высакародную задачу ВЛКСМ — выхоўваць моладзь сапраўднымі марксістамі — ленінцамі, кіраўнікамі вытворчасці, штодзённа клапаціцца аб іх ідэйным росце. Але гэтая работа іншы раз падмяняецца або заклікамі, або культурніцтвам. І ў адным і ў другім выпадку характар чалавека застаецца таямніцай. Калі ён дае расткі добрых спраў—яго не заўсёды заўважаюць. Больш за ўсё ўзносяць тых, чые імёны пераходзяць з аднаго сходу на другі, хоць куды карысней было б назваць новыя прозвішчы, новых старанных актывістаў, бо кожнае новае імя—безумоўны поспех камсамольскай арганізацыі.

Бачыць чалавека, лічыцца з яго запатрабаваннямі з мэтай умацавання, развіцця добрых пачаткаў яго характару—гэтаму вучаць камсамольскіх важакоў рашэнні XV з'езда ВЛКСМ і III пленума ЦК ЛКСМБ. Гэтаму вучыць партыя, народ. Камітэт камсамола універсітэта і актывісты факультэтаў павінны ўзяць справу ажыццяўлення гэтай задачы пад асабістую адказнасць.

П. ПАБОКА.

# ТАК СВЯЦІЦЬ КОЖНАМУ «КП»

**«КП»... Даўно гэтыя літары ўвайшлі ў наш побыт, і мы неяк вельмі хутка прывыклі да іх, як прывыкаем да ўсяго лепшага, добрага, што акружае нас, а іншы раз і да дрэннага. Бывае так, што мы не заўсёды заўважаем дробязі, з якіх потым складваюцца вялікія недахопы, нараджаецца раўнадушша. Калі схопішся, бывае ўжо часам позна. Каб не ступіць на гэтую трэцюю ступеньку і павінен прысці на дапамогу добры сябра камсамола—«КП»—вораг да ўсякага раўнадушша. Хто з гэтым не згодзен, няхай паглядзіць на першы ў гэтым навучальным годзе выпуск «КП» хімфака. Ніводзін чалавек не мог застацца обыякавым, чытаючы яго. Адны смяяліся, пагладаючы на яркія карыкатуры, другія засталіся задаволенымі змястоўнымі подпісамі. «Здорава!», «Малайцы!» — такія словы можна было чуць амаль ад кожнага, хто чытаў «КП» хімфака. Я дадам, што гэтая пахвала заслужаная. І не таму, што хімікі адкрылі нешта геніяльнае, да гэтага часу невядомае сусвету, а таму, што яны гучна сказалі сваё слова аб самым надзённым, аб самым неабходным, наспелым. Прычым, сказалі гэтае слова не проста дзеля прыгожага крытыканства, а дзеля ліквідавання тых недахопаў, якія перашкаджаюць студэнтам вучыцца і дружна жыць.**

**Хіба невядома было да гэтага часу, што ў інтэрнаце № 1 нельга паглядзець тэлеперадачы! Хіба не ведаюць і аб тым, што падлога ў інтэрнаце ў дрэнным стане, нават не пафарбавана! І гэта ў той час, калі сцены, якія зусім можна было не бяліць, пабелены. А няўжо так цяжка зрабіць электрычныя разеткі, калі не ў кожным пакоі, дык хоць бы ва ўмывальніках, каб студэнты маглі пагаліць свае бароды і папрасаваць штаны!! Як бачыце, «КП» вядзе размову аб самых-элементарных рэчах першай неабходнасці. Сюды можна дадаць і тое, што не ва ўсіх пакоях маюцца чайнікі, радыёдынамікі, тумбачкі... Галоўнае тое, што пра ўсё гэта размова вядзецца не з тым запалам, каб каго-небудзь абразіць, а па-дзелавому, з канкрэтнымі прапановамі.**

**Пахвальна, што студэнты-хімікі пажадалі папрацаваць на будоўлях і прадпрыемствах горада, каб на заробленыя грошы адрамантаваць інтэрнат. Гэта выдатная ініцыятыва, якую хутка падтрымалі нават і тыя, хто не жыве ў інтэрнаце. «КП» і вядзе сапраўдную размову пра тое, як студэнтам самім праяўляць вялікія клопаты аб дабрабыце. Менавіта так павінны ставіцца і вырашацца розныя пытанні ў «Камсамольскіх пражэктарах» усіх факультэтаў.**

**Дарэчы, не толькі студэнты другога курса Юра Бражнікаў, Алег Цімашэнка, але і студэнты-першакурснікі Ала Валынец, Юра Мароз, Люда Майсеёнак і іншыя з'явіліся «віноўнікамі» паспяховага рэйда № 1. Цікава адзначыць і такую дэталь, што ў выпуску «КП» № 1 прыняло ўдзел 30 чалавек. Усім хапала работы. А дзе масавасць—там і поспех. Непасрэдна ў выпуску вызначыліся ветэран газеты хімікаў студэнт чацвёртага курса Анатоль Жукоўскі, а таксама Тамара Прыцыцкая, Ігар Рудэнка, Леанід Круль і іншыя.**

**Адказны за выпуск Генадзь Кажушкоў лічыць, што поспеху работы «КП» садзейнічае не толькі масавасць, але і тое, што яны аб'ядналі рэдакцыю сценгазеты і «КП» у адзін баявы орган. У выніку гэтага вышла тры нумары газеты і «КП» з мноствам цікавых задум і планаў на будучае.**

**Вось так павінен свяціць «КП» на кожным факультэце!**

А. КРУГЛОЎ,
аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі.



**Настаўнік... Скажаш гэтае слова — і ўяўляеш сваю першую настаўніцу, яе заклапочанасць, каб мы ведалі шмат, каб у кожнага з нас была шчаслівая дарога ў будучыні. Вобраз першай настаўніцы застаўся ў нашай памяці на ўсё жыццё. Магчыма вось так запамятаецца і Люда Крошкіна, якая праз некалькі год пачне настаўнічаць, дапытлівым хлопчыкам і дзяўчынкам... А пакуль у студэнткі II курса аддзялення рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта ідзе напружаная вучоба, якую яна спалучае з вялікай грамадскай работай.**

**Фота С. СУПРУНА, В. ДАНІЛЕНКІ.**

# РАСКАЗВАЕ БРАТ ПІСЬМЕННІКА

*Край наш бедны, край наш родны!*
*Лес, балоты і пясок,*
*Чуць дзе крыху луг прыгодны...*
*Хвойнік, мох ды верасок...*

*Гэта радкі першага верша, з якім карыфей беларускай літаратуры Якуб Колас выступіў у друку. Верасень 1906 года і прынята лічыць пачаткам літаратурнай дзейнасці пісьменніка. Такім чынам, у гэтым годзе споўнілася 60 год з пачатку выступлення Якуба Коласа ў друку.*

*З выпадку юбілея ў актавай зале нашага факультэта адбылося пасшыранае пасяджэнне кафедры беларускай літаратуры. Адкрываючы пасяджэнне, прафесар М. Р. Ларчанка прадстаўляе слова выкладчыку С. Х. Александровічу.*

*— У пісьменніка два нараджэнні, — гаворыць прамоўца. — Першае, калі ён сам нараджаецца, і другое, калі ў першыню ў друку паяўляецца яго твор.*

*Громам апладысментаў сустрэлі студэнты роднага брата Якуба Коласа — Іосіфа Міхайлавіча Міцкевіча.*

*— Дарагія студэнты! — гаворыць ён. — Сёння мне ад шчырага сэрца хочацца гаварыць з вамі аб Коласу не толькі як аб вялікім пісьменніку, але і як аб родным брату, як аб чалавеку.*

*Многа цікавага расказаў ён прысутным. Потым Іосіф Міхайлавіч з вялікай задушэўнасцю прадэкламаваў урыўкі з «Новай зямлі».*

*На пасяджэнні прысутнічаў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Слесарэнка. Ён прачытаў некалькі твораў Якуба Коласа.*

*У заключэнне пасяджэння Іосіф Міхайлавіч адказаў на цікавячыя студэнтаў пытанні з жыцця і дзейнасці выдатнага беларускага пісьменніка.*

**В. ВАНЬКОВІЧ,**
**студэнт чацвертага курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**
**(Газета «Слова філолага»).**

# На дарогах дружбы

**АФРЫКАНСКІЯ** студэнты з Конга (Бразавіль), Камеруна, Замбіі, Радэзіі, што навучаюцца на падрыхтоўчым факультэце нашага універсітэта, пабывалі ў Доме-музеі I з'езда РСДРП, агледзелі пакой-кватэру, дзе адбываўся з'езд, пазнаёміліся з дакументамі, звязанымі з жыццём і дзейнасцю Ул. І. Леніна і іншых буйнейшых дзеячоў Камуністычнай партыі.

**ГРУПА** в'етнамскіх студэнтаў наведала Літаратурны музей Янкі Купалы, дзе госці даведаліся шмат цікавага аб жыцці, грамадскай і літаратурнай дзейнасці народнага паэта Беларусі.

**У ФЕСТЫВАЛІ** дружбы, прысвечаным 30-годдзю Мінскага Палаца піянераў і школьнікаў, прынялі ўдзел в'етнамскія студэнты з нашага універсітэта. Зарубежныя сябры расказалі прысутным аб мужнай барацьбе свайго народа супраць амерыканскіх агрэсараў, выканалі «Марш вызвалення» і іншыя в'етнамскія патрыятычныя песні. На фестывалі дружбы прысутнічалі госці з Латвіі, Эстоніі і іншых саюзных рэспублік, а таксама студэнты розных замежных краін.

# РЫХТАВАЦЦА ДА СЕСІІ СТАРАННА, ЦЯПЕР

## НА ФІНІШНАЙ ПРАМОЙ — ДЫПЛАМАНТЫ

У аўдыторыю ўваходзіць дацэнт Марк Саламонавіч Зярніцкі. Вітаецца. Чамусьці доўга не аб'яўляе тэмы сённяшняй лекцыі. Нам вядома: згодна праграме павінен чытацца «Рабселькораўскі рух на Беларусі ў 20-х гадах». Але ўсе мы памыліліся. Размова пайшла аб дыпломных работах. Я запомніў яе. Усё было, як на паверцы. Называліся прозвішчы, і той, каго выклікалі, уставаў.

Юрый Сапажкоў:

— Тэма дыпломнай? Творчая. Хачу прадставіць шэраг нарысаў пра людзей маладога горада.

Аляксандр Сафроненка:

— «Газета «Автозаводец» у барацьбе за тэхнічны прагрэс».

Большасць пры пытанні «Тэма?» абавязкова падкрэслівае—«творчая». Жанры, выбраныя дыпламантамі, розныя: рэпартаж, артыкул, радыёрасказ, нарыс. Адным хочацца расказаць у матэрыялах пра бясконцасць дабраты чалавечай (Зіновій Прыгодзіч), іншым—пра нашага сучасніка, які не заўсёды едзе шукаць рамантыку за трыдзевяць зямель, а знаходзіць яе тут, у сваёй рэспубліцы, у самай звычайнай прафесіі будаўніка.

Я разумею, тыя, хто смела ўзяўся за творчую дыпломную, любяць сваю прафесію, любяць і хочуць даказаць, што нездарма выбралі яе, што яна для іх адзіная.

Цяпер мы часта раімся, спрабуем абмеркаваць тое, што павінны зрабіць у будучай дыпломнай. Вядома, што гэта наша справаздача за пяць год. Усе веды, якія мы атрымалі ва універсітэце, трэба прыцягнуць на дапамогу і, вядома, кожны хвалюецца, ужо зараз у думках імкнецца зрабіць сваю дыпломную змястоўнай і цікавай. Хваляванне наша не беспадстаўнае: часу да абароны застаецца мала. Зразумела: рыхтавацца і да дзяржаўных экзаменаў, і адначасова пісаць дыпломную— справа не з лёгкіх. Апрача ўсяго, чамусьці будучая зімовая сесія атрымалася самай складанай за ўсе пяць гадоў. Толькі чатыры філасофскія дысцыпліны, шэсць экзаменаў, залікі... Мы часта гаворым аб гэтым. І суцяшаемся: нічога не зробіш—праграма...

Пра тых, хто ўзяў творчыя тэмы, можна многа расказваць. Пра першыя іх поспехі, пра пошукі герояў...

Ну, а тыя, чыя думка імкнецца да даследавання, выбралі сабе тэарэтычныя тэмы. У іх ёсць свае любімыя пісьменнікі, журналісты, крытыкі. Творчасць многіх з іх яшчэ слаба даследавана, або зусім не даследавана. Чым цікавей, тым большай будзе радасць першаадкрыцця. І можа таму Яня Смаленская ўзялася даследаваць тэлеспектаклі беларускай студыі тэлебачання, якія паказваліся некалькі гадоў назад і аб якіх да гэтага часу не напісана ні радка.

Мы пакуль што не развітваемся са сваёй альма-матэр. Мы—дыпламанты. І зараз я проста жадаю поспехаў, удач і творчага плёну маім аднакурснікам.

**І. КАПЫЛОВІЧ,**
**студэнт пятага курса аддзялення журналістыкі.**

## КОШТ «ЛІШНІХ» ГАДЗІН

Вячэрняе навучанне. З кожным годам усё больш разгараюцца спрэчкі вакол гэтых слоў. Адны кажуць, што патрабаванні да вячэрняй і завочнай адукацыі панізіліся, другія не згаджаюцца з гэтым. У актыўных пошуках і спрэчках нараджаюцца нярэдкія удачы. Аднак справядлівыя папрокі на адставанні форм вячэрняга навучання ад запатрабаванняў жыцця яшчэ не спыняюцца. І пераадолець, скараціць гэтыя адставанні чамусьці нялёгка. А чаму?

Вячэрняе навучанне вядзецца у нас ужо не першы год. За гэты час накоплен вялікі вопыт, але некаторыя карэнныя пытанні яшчэ чакаюць сваёй чаргі. Адным з іх з'яўляецца вытворчая практыка. У падрыхтоўцы будучых журналістаў значнае месца займае вывучэнне філалагічных дысцыплін. Гэта правільна. Але кепска, калі для вучобы па профілю застаецца мала часу. Прычым, большая частка гадзін адводзіцца для чытання лекцый у аудыторыі. Для практыкі—толькі «лішнія» гадзіны. Іх не хапае на непасрэдныя сустрэчы з майстрамі пяра, знаёмствы з практыкай работы аддзелаў газет, іх поштай, падрыхтоўкай рукапісаў да друку. А, вядома, што усё гэта дае шмат карыснага і патрэбнага для фарміравання і росту будучага спецыяліста ў працэсе навучання.

Калі ў студэнтаў стацыянара ёсць такая магчымасць, дык у вячэрнікаў яна раўняецца нулю. Хіба можна задаволіць, напрыклад, практыка на другім і трэцім курсах вячэрняга аддзялення журналістыкі? У нас былі аднаразовыя двух-трохгадзінныя наведванні студыі тэлебачання, радыёкамітэта, БЕЛТА і рэдакцый газет «Знамя юности» і «Чырвоная змена». На гэтым усё. Такія практычныя заняткі больш падобны на экскурсіі. Большасць студэнтаў нашай групы — людзі, якія працуюць на прадпрыемствах. Працуюць яны да пяці гадзін вечара. Наведванне рэдакцый у вячэрні час карысці прыносіць мала. У бягучым годзе ў нас павінна быць двухтыднёвая практыка, хочацца атрымаць ад яе многае. Практыка, на нашу думку, павінна дапамагчы не толькі замацаваць атрыманыя веды, навыкі, але і абагаціць іх жывым вопытам.

Не лепшая справа у нас атрымліваецца і з курсавымі работамі. Першую і пакуль што адзіную курсавую работу мы пісалі у другім семестры трэцяга курса. Па першае, як кажа прымаўка, першы блін не заўсёды глытаецца. Узнікае пытанне, чаму ў папярэднія гады у нас не было курсавых работ? Курсавая ж — гэта пробны камень для самастойнай работы студэнта-журналіста.

**Л. КАМАРОЎ,**
**студэнт чацвертага курса вячэрняга аддзялення журналістыкі.**

## Сустрэча з музыкантамі

**З вялікай цікавасцю сачыла грамадскасць Беларусі за IV з'ездам кампазітараў нашай рэспублікі.**

**З творчай справаздачай перад слухачамі выступілі вядучыя музыканты і кампазітары. Сваёй дзівоснай мовай музыкі яны расказалі, з чым прышлі, чаго дасягнулі на парозе 50-годдзя Савецкай улады.**

**Адна з такіх цікавых сустрэч адбылася 15 лістапада ў нашым універсітэце. У актавай зале гуманітарнага корпуса перад слухачамі выступіла Дзяржаўная Акадэмічная харавая капэла пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Рыгора Шырмы. Артысты прыпаднеслі слухачам вялікую і цікавую праграму, якая складалася з песень Цікоцкага, Багатырова, Смольскага, Вагнера, Тырманд, Семянякі і іншых.**

**У зале адбыліся знаёмствы студэнтаў з кампазітарамі. За вялікі музычны падарунак выхаванцы універсітэта ўзнагародзілі артыстаў букетамі кветак.**

В. ХАДАСОЎСКІ.
**Фота аўтара.**



## ВЫДАТНЫ РАЗБЕГ

**Канец лістапада заўсёды вызначаецца асаблівым разгарам семінарскіх заняткаў. І гэта не дзіўна: праз паўмесяца пачнуцца залікі, а пасля і экзамены. Студэнты прыкладаюць шмат намагання на тое, каб дасканала праверыць свае веды, на колькі кожны з іх падрыхтаваўся да сесіі. Аб тым, як старанна адносяцца студэнты да вывучэння грамадскіх дысцыплін гавораць факты вялікай актыўнасці на практычных занятках, грунтоўнае веданне імі першакрыніц класікаў марксізма-ленінізма.**

**Так было і на другім курсе хімфака ў 6-й групе. Праходзіў семінар па гісторыі КПСС, вывучаліся рашэнні XXII з'езда партыі. Адразу скажу, што група па вучобе сярэдняя, аднак выступленні студэнтаў мне спадабаліся.**

**Прыкладам вялікага жадання авалодаць ведамі па гісторыі і рашэннях Камуністычнай партыі з'яўляецца тое, што большасць студэнтаў падрыхтавала змястоўныя рэфераты па ўсіх пытаннях семінара. Таму ён праходзіў на высокім навуковым узроўні. Кожная праблема разбіралася ўсебакова, цесна звязвалася з сучаснасцю. Таму на занятках было многа выступаючых, усім хацелася выказаць свае думкі і нават свае назіранні аб тым, як на справе здзяйсняюцца рашэнні з'езда. Не дзіўна, што за дзве акадэмічныя гадзіны выступіў амаль кожны. Асабліва актыўнічаюць і старанна рыхтуюцца да семінараў Таня Кузняцова, Надзя Герасіменка, Вера Фаміна, Лена Буслоўская, Ларыса Сцяпанава.**

**Выкладчык П. М. Лебедзеў, паказваючы свае заключэнні аб выступленнях студэнтаў на практычных занятках, сказаў:**

**— З кожным чарговым семінарам я ўсё больш і больш пераконваюся ў тым, што група ўзяла выдатны разбег. І мне здаецца, што фініш на экзамене будзе добры.**

А. НАЎМЧЫК.

Е. Л. БОНДАРОВА,
член саюза,
кінематаграфістаў
СССР.

# ЯК ГЛЯДЗЕЦЬ ФІЛЬМ?

*Ефрасіння Леанідаўна Бондарава — адна з вядомых беларускіх кінакрытыкаў. Яе рэцэнзіі, нататкі аб творах кінамастацтва рэгулярна з'яўляюцца на старонках беларускага перыядычнага друку. Ефрасіння Леанідаўна — член Саюза журналістаў СССР, член Саюза кінематаграфістаў СССР. Акрамя таго, яна займаецца выкладчыцкай дзейнасцю. З'яўляецца дацэнтам кафедры савецкай журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна.*

*Сёння мы прадастаўляем ёй слова.*

**Як глядзець кінафільм! Адны могуць здзівіцца, пачуўшы такое пытанне: хіба не вядома «як»! Другія могуць угледзець спробу неяк рэгламентаваць кінагледача. Трэція адкажуць: усё залежыць ад таго, што глядзіш. Добры фільм захапляе ўсіх, дрэнны — нікога. Значыць, трэба выпускаць на экраны добрыя фільмы, і ніякай праблемы гледача не будзе. Гэта бяспрэчна, што патрэбны добрыя фільмы.**

**Але ж пакуль што такой ідыліі не назіраецца. Разам з паўнацэннымі кінатворамі нямала паказваецца шэрых, рамесніцкіх ці ілжэнаватарскіх падробак пад іх. Пастаўляюць іх і нашы савецкія і зарубежныя кінастудыі. Органы кінапракату па розных прычынах выпускаюць нямала такіх кінастужак. Яны ідуць, як кажуць, у народ і робяць сваю, не заўсёды высакародную справу. Адны праходзяць бяследна, другія выклікаюць расчараванне, а іншыя, як ні дзіўна, знаходзяць сваіх прыхільнікаў.**

**У той жа час нярэдкія яшчэ выпадкі, калі сапраўды цікавы і арыгінальны кінатвор прымаецца з халадком, без асаблівай зацікаўленасці, лічыцца сумным ці незразумелым. Нягледзячы на высокую ацэнку прафесіянальнай крытыкі, частка кінафільмаў дэманструецца пры незапоўненых кіназалах. Успомніце, з якой трывогай пра гэта гаварылі дэлегаты І Усесаюзнага з'езда кінематаграфістаў, які адбыўся ў лістападзе мінулага года. Пра гэта ж ішла гаворка і на нядаўнім Усесаюзным сімпозіуме кінакрытыкаў і кіназнаўцаў.**

**Ні для каго, відаць, не з'яўляецца сакрэтам той факт, што поўныя філасофскага роздуму фільмы па сцэнарыях А. П. Даўжэнкі «Паэма пра мора», «Аповесць палымяных год» і «Зачараваная Дзясна» паглядзела значна меншая колькасць гледачоў, чым такія, напрыклад, павярхоўныя прыгодніцкія і дэтэктыўныя фільмы, як «Чалавек-амфібія», «Аперацыя «Кобра» і ім падобныя. Поўныя паэзіі «Цені забытых продкаў» многія не прыкмецілі. Абмінаюцца гледачом некаторыя выдатныя творы зарубежнага кіно. Затое дзесяткі мільёнаў прагледзелі і зараз глядзяць замаскіраваныя пад захапляльнасць кінатрафарэты «Цудоўная сямёрка», «Парыжскія тайны», «Жалезная маска» ці меладрамы з мяшчанскай мараллю, накштальт «Чорных акуляраў».**

**У чым тут справа! Часткова ў тым, што ва ўсе часы кінагледача вабяць стужкі з дынамічным сюжэтам, з вострымі сітуацыямі і актыўнымі героямі. А іх не стае нашаму экрану. Таму амаль кожная не застаецца не прыкметнай. Разам з тым адчуваецца і неразборлівасць значнай часткі гледачоў, іх няўменне адрозніць сапраўды цікавы і змястоўны твор ад лоўка схаванай пад знешняй займальнасцю імітацыі мастацтва. Вось і выходзіць, што далёка не ўсе могуць быць сапраўднымі кінагледачамі. Вось для такіх і хацелася б даць некалькі парад.**

**Перш-наперш варта разабрацца, спытацца ў самога сябе: што я шукаю ў мастацтве наогул, у кінамастацтве ў прыватнасці! Ці толькі забавы, адцягнення увагі ад штодзённых клопатаў! Тады гэта вельмі мала. Мастацтва здольна на значна большае. Яно можа натхняць, уплываць на думкі і пачуцці, на ўвесь духоўны воблік чалавека. Але гэта пад сілу толькі сапраўдным творам мастацтва, тым, якія напоўнены глыбокім зместам, азораны перадавой ідэяй, вызначаюцца дасканаласцю формы. Сапраўдны твор уздзейнічае на чалавека ўсёй сваёй сутнасцю, захапляе і розум і пачуцці. Пад уражаннем такога твору хочацца заглянуць ва ўласную душу, узважыць свае ўчынкі і намеры. Хіба застаўся хто-небудзь не ўзрушаны пасля сустрэчы, скажам, з фільмам «Балада пра салдата»! Высакародныя ўчынкі яго галоўнага героя, простага сялянскага хлопца-**

(Працяг на 4-й стар.).

